HTTPS://PRESCHOOL-CENTR.BSPU.BY/

## ПАМЯТКА ПА ВЫХАВАННІ ДЗІЦЯЦІ-БІЛІНГВА Ў СІТУАЦЫІ БЛІЗКАРОДНАСНАГА РУСКА-БЕЛАРУСКАГА ДВУХМОЎЯ

- **Пры выхаванні дзіцяці–білінгва варта больш старанна сачыць за развіццём яго моўных навыкаў на дзюх блізкароднасных мовах (у нашым выпадку – рускай і беларускай).**

- **Стымулюйце дзіця да выкарыстанння абедзвюх блізкароднасных моў ва ўсіх магчымых сферах іх ужывання.**

- **Навучыце дзіця гаварыць на дзвюх дзяржаўных мовах, нават калі выхаванне ў сям'і вядзецца толькі на адной з іх.**

- **Знаёмце дзіця з нацыянальнымі культурамі, гэта надасць абедзвюм мовам выразнасць і эмацыйную афарбоўку.**

- **Матывіруйце дзіця адказваць на той мове, на якой да яго звяртаюцца.**

- **Арыентуйцеся на зносіны з дзіцем, а не кантроль яго маўлення.**

- **Пакажыце, што для вас большую значнасць мае змест паведамлення, а не вымаўленне і абраная мова.**

- **Будзьце гатовыя да таго, што дзіця не пазбавіцца ад звычкі ўстаўляць у гаворку словы з другой мовы.**

- **Памятайце, што некаторыя дзеці ўсё ж лічаць роднай толькі адну мову. Выхаванне дзіцяці-білінгва варта ажыццяўляць як дапамогу ў пошуку свайго шляху ў мову, пэўнай маўленчай мадэлі паводзін праз культуру або найбольш упадабаваную мову.**

